**БА́БІНА ЛЕ́ТА**, у *народным календары* пара цёплага надвор'я ў 2-й палавіне верасня — пачатку кастрычніка. Дні Б.л. надыходзілі насля значнага пахаладання. На Беларусі бывае штогод і прадаўжаецца ад некалькіх дзён да двух тыдняў. Назва паходзіць ад таго, што на гэты час прыпадала пераважна «бабская» работа на агародзе і ў полі, а магчыма, ад таго, што гэтае кароткае «лета» атаясамлівалі з кароткім «бабіным векам». Пагодлівае надвор'е спрыяла ўборцы гародніны, копцы бульбы, у гэты час церлі і трапалі каноплі і лён. З назвай Б.л. звязана шмат нар. песень. На Мядзельшчыне Б.л. называлі тыдзень перад *Пакровамі*, калі праводзілася *варажба* на «шчаслівую бабулю» (*бабку-павітуху*). Усе дні Б.л. загадзя размяркоўвалі паміж бабкамі-павітухамі, што практыкавалі ў наваколлі: напрыклад, панядзелак — Тэклі, аўторак — Юстыны, серада — Марцэлі і г.д. На чый дзень выдавалася сонечнае і ціхае надвор'е, лічылася, што рука ў той бабулі лёгкая і шчаслівая, адпаведна і роды будуць лёгкія, дзіця — шчаслівае. «Светлая варажба» надавала ўпэўненасць будучым маці ў паспяховым заканчэнні іхняй цяжарнасці.

*У. А. Васілевіч, Л. М. Салавей.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ